конструктивного диалога и готов к культурному взаимообогащению. Но при этом он никогда не растворится и не затеряется в чужих культурных пространствах. Его любовь к Родине – это сыновья любовь. Такая любовь вовсе не означает кичливую гордость за успехи своей страны, своего государства на международной арене. Подлинный патриотизм не кичлив, не публичен, ибо основан на глубинных, а не на суетных ценностях.

**А.І.Смолік,** *прафесар*

## ІДЭАЛОГІЯ ЯК КУЛЬТУРНАЯ СІСТЭМА

У сучасных грамадскіх навуках замацавалася ацэначнае разуменне ідэалогіі. Прадстаўнікі гуманітарных дысцыплін пакуль не сумелі развіць па-сапраўднаму безацэначнае паняцце ідэалогіі, хаця гэтае паняцце ўведзена ў навуковы ўжытак яшчэ ў першай палове XIX ст. французскім філосафам і эканамістам А.Дэсцют дэ Трасі ("Элементы ідэалогіі", т.1–4, 1801–15) для абазначэння навукі аб ідэях як асновы этыкі, маралі і палітыкі. Пазней пад ідэалогіяй сталі разумець не вучэнне пра ідэі, а самі ідэі, погляды, вучэнні, якія валодаюць спецыфічнымі прыметамі. К.Маркс і Ф.Энгельс разглядалі ідэалогію як гістарычна зменлівыя погляды, адносілі да іх рэлігійныя і ідэалістычныя вучэнні. Сваё філасофска-сацыяльнае вучэнне яны таксама адносілі да ідэалогіі. У.І.Ленін увёў паняцце навуковай ідэалогіі для характарыстыкі марксізму.

Як бачым, ужо напачатку свайго ўзнікнення разглядаемае паняцце было сацыяльна абумоўлена, што скажала сутнасць ідэалогіі. На наш погляд, карані гэтай няўдачы – не столькі ў метадалагічнай недысцыплінаванасці, колькі ў тэарэтычнай недасканалаці. Недасканаласць гэта праяўляецца перш за ўсё ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыходзе да ідэалогіі як да самастойнай сутнасці – гэта значыць да ўпарадкаванай сістэмы культурных сімвалаў.

Думаецца, пры вывучэнні яе сацыяльных і псіхалагічных кантэкстаў неабходна выкарыстоўваць больш тонкі аналітычны інструментарый. Як пры рабоце з інструментам выяўляюцца яго схаваныя дэфекты, так і пры выкарыстанні ацэначнага ўяўлення аб ідэалогіі становяцца відавочнымі ўнутраныя слабасці апошняга. І найбольш выпукла яны бачныя ў даследаваннях сацыяльных вытокаў і наступстваў ідэалогіі, паколькі ў такіх даследаваннях гэтае паняцце ўключана ў апарат сістэмнага аналізу грамадства і асобы, і сама сіла гэтага аналізу толькі падкрэслівае недахоп аналагічнай сілы ў культурнага боку (г.зн. у сімвалічных сістэм).

Сёння існуюць два галоўныя падыходы да вывучэння сацыяльных фактараў ідэалогіі: тэорыя інтарэсаў і тэорыя напружанняў. У тэорыі інтарэсаў ідэалагічныя праблемы разглядаюцца на фоне ўсеагульнай барацьбы за карысць, у тэорыі напружанняў – на фоне пастаянных спроб выправіць сацыяльна-псіхалагічны дысбаланс.

У адпаведнасці з першай людзі ўвесь час імкнуцца да ўлады; у адпаведнасці з другой – увесь час пазбаўляюцца ад трывогі. На прынцыпах інтарэсаў пабудавана марксісцкая ідэалогія, якая зліла ў адзін сплаў палітычныя тэорыі і палітычную барацьбу. Згодна тэорыі інтарэсаў ідэі – гэта зброя, найлепшым спосабам укараніць у грамадства якую-небудзь карціну свету – гэта захапіць палітычную ўладу і ўмацаваць яе.

Тэорыя напружанняў пабудавана на гіпотэзе, што няма грамадскага ўладкавання, якое б дастаткова паспяхова спраўлялася з узніклымі функцыянальнымі праблемамі. Кожнае грамадства сутыкаецца з невырашальнымі антыноміямі: паміж свабодай і палітычным парадкам, паміж стабільнасцю і неабходнасцю змен, паміж эканамічнай эфектыўнасцю і гуманнасцю, паміж педантычнасцю і гнуткасцю і г.д. Гэта сацыяльнае напружанне праяўляецца на ўзроўні асобнага

індывіда ў выглядзе псіхалагічнага напружання. У сувязі з гэтым ідэалалагічнае мысленне разглядаецца як адзін з адказаў на гэты адчай. Таму амерыканскі ідэолаг Ф.Сутан дае азначэнне ідэалогіі як структураванай рэакцыі на структурныя напружанні сацыяльнай ролі. Яна ўяўляе сімвалічны выхад для народжаных грамадскім дысбалансам эмацыянальных парушэнняў.

Але ні тэорыя інтарэсаў, ні тэорыя напружанняў не змаглі да канца выявіць сутнасць ідэалогіі. На гэтай падставе прыхільнікі канцэпцыі дэідэалагізацыі (Р.Арон, Д.Бел і інш.) разглядаюць ідэалогію як суб'ектыўна прадузятае і адпаведна ненавуковае адлюстраванне інтарэсаў розных сацыяльных груп.

На наш погляд, у грамадстве, акрамя сацыяльнага і псіхалагічнага напружання, існуе культурнае напружанне. Асабліва яно ўзрастае ў перыяд трансфармацый. Мы маем на ўвазе страту духоўных арыенціраў, каштоўнасцей, ідэалаў. Вось гэтае культурнае напружанне цягне за сабой ідэйнае замяшанне, паколькі звыклыя ўзоры палітычнага ўладкавання ці губляюць актуальнасць, ці аказваюцца дыскрэдытаванымі. Менавіта тады, калі выяўляецца адсутнасць культурных рэсурсаў, з дапамогай якіх можна асэнсаваць узніклую грамадска-псіхалагічнную напружанасць, з'яўляюцца некалькі ідэалогій (палітычных, маральных, эканамічных).

На наш погляд, заслугоўвае ўвагі аксіялагічная канцэпцыя ідэалогіі, створаная Т.Парсансам, У.Матцам, Г.Альбертам, Т.Гайерам. Па іх меркаванні, ідэалогія – гэта сістэма каштоўнасцей дадзенага грамадства, якая выконвае функцыі арыентацыйнай падсістэмы.

Сучасныя прадстаўнікі тэорыі рэідэалагізацыі (Э.Вінер, О.Лемберг і інш.) таксама разглядаюць ідэалогію як сістэму ідэй, што вызначаюць каштоўнасці цывілізацыі. Яны зыходзяць з тэорыі ідэй, якая была распрацавана яшчэ Платонам. Ён меркаваў, што ідэі не залежаць ад часу і прасторы, што існуюць самі па сабе як нейкі ідэальны свет, з якога яны пранікаюць у чалавечую свядомасць як водбліскі сапраўднага і звышрэаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага і прымушаюць чалавека адчуваць і дзейнічаць інакш, чым ён робіць гэта пад уплывам паўсядзённай рэчаіснасці. У Старажытнай Грэцыі сфарміравалася і паняцце "вучэнне" (логас) як упарадкаваныя веды аб касмічных, сацыяльных і чалавечых уласцівасцях.

Калі ўлічыць, што структурнымі элементамі духоўнай культуры з'яўляюцца веды, каштоўнасці, ідэі, нормы, сэнсы, рэлігія, навука, то можна прыйсці да высновы, што ідэалогія ўяўляе сабой упарадкаваную культурную сістэму.

Асноўным прызначэннем ідэалогіі з'яўляецца арыентацыя на сацыяльныя дзеянні. Гэтыя арыенціры кансалідуюць членаў грамадства, вызначаюць іх грамадскую актыўнасць і накіроўваюць яе. Безумоўна, без засваення сістэмы каштоўнасцей немагчыма выпрацаваць паўсядзённыя арыентацыі, пазітыўныя матывацыі. Каштоўнасці дапамагаюць асобе і грамадству аддзяліць справядлівае і несправядлівае, добрае і дрэннае, ідэальны ці пазбягаемы стан, ісціну і памылку, дазволенае і забароненае і г.д. Ідэалогія павінна гарманізаваць суадносіны паміж каштоўнасцямі і паўсядзеннымі арыентацыямі, ліквідаваць разрыў, разыходжанне паміж абавязкам і жаданнем, паміж прызнаннем высокага значэння якой-небудзь каштоўнасці і яе недасягальнасцю.

На наш погляд, важным сродкам ліквідацыі разрыву паміж каштоўнасцю і паводзінамі з'яўляецца глыбокае засваенне каштоўнасцей, пераўтварэнне іх у перакананні.

У вышэйшай школе закладзены вялікія магчымасці фарміравання каштоўнасных арыентацый. Па-першае, гэта вывучэнне грамадскіх дысцыплін, у якіх аналізуюцца вітальныя, сацыяльныя, палітычныя, маральныя, рэлігійныя, эстэтычныя і іншыя катэгорыі каштоўнасцей. У вучэбных планах прадугледжаны цэлы блок дысцыплін (каля 2000 гадзін), якія дазваляюць выкладчыкам пераканаць студэнтаў у значэнні прыярытэтных культурных каштоўнасцей. Да іх у першую чаргу

адносяцца патрыятызм, дабро, абавязак, гонар, спаведлівасць, узаемадапамога, любоў, сумленнасць, працалюбства і інш.

Профіль нашага універсітэта вызначыў змест і спецыяльных дысцыплін, якія ўтрымліваюць элементы вітальных, сацыяльных, маральных і эстэтычных каштоўнасцей. Вывучэнне мастацкіх дысцыплін дазваляе спасцігаць такія каштоўнасці, як прыгажосць, гармонія, ідэал і інш.

Уласна ідэалогіяй з'яўляюцца рэлігія і філасофія, якія зыходзяць з ідэалізаванага, бясконцага быцця і небыцця; ідэалагічныя кампаненты прысутнічаюць у эканамічнай тэорыі, паліталогіі, эстэтыцы.

Вышэйшая школа ў якасці важнейшай задачы прадугледжвае ўзбраенне будучых спецыялістаў трывалымі тэарэтычнымі, эмпірычнымі і духоўнымі ведамі, якія фарміруюць уяўленні аб працэсах у прыродзе і грамадстве. Веды фарміруюць погляды маладых людзей на сацыяльныя і культурныя працэсы і з'явы. Таму важнейшай задачай дэканатаў і кафедраў з'яўляецца выпрацоўка эфектыўнай сістэмы арганізацыі навучальнага працэсу.

---

1. *Гирц К.* Интерпретация культур / пер. с англ. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2004.

2. *Майхрович А.С.* Идеология, сущность, назначение, возможности. – Мн., 2001.

3. *Основы* идеологии белорусского государства: учеб. пособие для вузов / под общ.ред. С.Н.Князева, С.В.Решетникова. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004.

4. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты: учеб.-метод. пособие. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ